ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

# Ян Чыквін (1940–2022)

14 лістапада 2022 года памёр вядомы беларусіст, прафесар, паэт і перакладчык Ян Чыквін.

Ян Чыквін нарадзіўся 18 мая 1940 года ў Дубічах-Царкоўных на Падляшшы, скончыў беларускі ліцэй у Бельску, потым філалагічны факультэт Варшаўскага універсітэта. З 1969 г. выкладаў гісторыю рускай і беларускай літаратур у філіяле Варшаўскага ўніверсітэта ў Беластоку, Варшаўскім універсітэце, Універсітэце ў Беластоку. Займаўся вывучэннем старарускай літаратуры і найноўшай беларускай літаратуры, з'яўляецца сярод іншага аўтарам зборніка літаратуразнаўчых артыкулаў *Далёкія і блізкія: беларускія пісьменнікі замежжа* (Беласток, 1997) і ўкладальнікам грунтоўнай анталогіі *Беларускія пісьменнікі Польшчы* (Мінск, 2000).

З 1956 г. друкаваўся ў беластоцкай „Ніве", быў адным з заснавальнікаў Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа" (1958 г.), з 1988 г. узначальваў гэтае аб'яднання. У 1998 г. пачаў выдаваць літаратурна-мастацкі часопіс „Тэрмапілы", нязменным рэдактарам якога з'яўляўся. Заснаваў і рэдагаваў таксама Бібліятэчку Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа", у якой выйшла больш за сто кніг паэзіі, прозы, драматургіі, публіцыстыкі.

Акрамя навуковых артыкулаў і манаграфій пісаў таксама паэзію і прозу, з'яўляецца аўтарам зборнікаў: *Іду* (1969), *Святая студня* (1970), *Неспакой* (1977), *Светлы міг* (1989), *Кругавая чара* (1992), *Свет першы і апошні* (1997), *Крэйдавае кола* (2002), *Пры стале агнявым* (2021).

Ян Чыквін неаднаразова рэцэнзаваў артыкулы для часопіса „Studia Białorutenistyczne", удзельнічаў як рэцэнзент у абаронах дактаратаў ва Універсітэце Марыі Кюры-Складоўскай у Любліне.